Урок беларускай літаратуры ў 7 "Б" класе

Дзяменцій Людміла Вапсільеўна,

настаўніца 2 катэгорыі гімназіі г.Быхава

# Тэма: Анатоль Вярцінскі. "Рэквіем па кожным чацвёртым" – напамін і запавет жывым.

**Мэты:**

*адукацыйная:* пазнаёміцца з літаратурнымі паняццямі "анафара", "эпіфара", якія дапамагаюць перадаць трагічны настрой верша;
*развіццёвая:* развіваць уменне выразна чытаць паэтычны тэкст, развіваць уменні і навыкі аналізу мастацкага твора, творчыя здольнасці і ўзбагачаць слоўнікавы запас вучняў пры абмеркаванні пытанняў;
*выхаваўчая:* абудзіць пачуццё болю за страты, панесеныя беларускім народам у час вайны, павагу да свайго народа, гонар за яго мужнасць і гераізм.

**Абсталяванне:** мультымедыйная прэзентацыя, дыск з запісам "Рэквіема" Моцарта, малюнак "Два полі", выкананы вучаніцай, падручнік, аркуш паперы з тэставым заданнем.

**Тып урока**: урок-споведзь.

## Ход урока

**I. Арганізацыйны пачатак.**

**II. Паведамленне тэмы і мэты ўрока**

- Добры дзень, шаноўныя вучні і госці! Вітаю вас усіх, жадаю плённай працы. Спадзяюся, што вы будзеце актыўнымі ўдзельнікамі і атрымаеце самыя высокія адзнакі.
Тэма нашага ўрока – "Рэквіем па кожным чацвёртым" – напамін і запавет жывым.
Сённяшні ўрок яшчэ раз пакажа нам, што каб стварыць мірную будучыню, трэба памятаць мінулае.

Мэты нашага ўрока ( слайд №1):
- ✓ Пазнаёміцца з паняццямі "анафара", "эпіфара";
- ✓ Прааналізаваць верш "Рэквіем па кожным чацвёртым";
- ✓ Прасачыць узаемасувязь літаратуры з іншымі відамі мастацтва.

**III. Уступнае слова настаўніка.**

22 чэрвеня 1941 года і 9 мая 1945 года – дзве даты, якія назаўсёды ўпісаны ў гісторыю нашай краіны. Паміж гэтымі датамі – боль, адчай, роспач. Паміж гэтымі датамі – вайна, якая спыніла жыццё кожнага чацвёртага беларуса.

Эпіграфам да нашага ўрока будуць словы Анатоля Вярцінскага: (слайд №2)
Я вас прашу, не зведаў хто вайны,
Прашу вас, мае дочкі і сыны,
Узяць хоць долю памяці маёй –
Каб потым ёй не зарасці травой.

**IV. Праверка дамашняга задання.**

1. Франтальнае апытванне

- На мінулым уроку мы з вамі пазнаёміліся з асобай Анатоля Вярцінскага, асаблівасцямі жанру "рэквіем". Давайце гэта прыгадаем.
- У якіх умовах прайшло дзяцінства Анатоля Вярцінскага?
- Як гэта адлюстравалася ў яго творчасці?
-Давайце ўспомнім, з якімі творамі мы знаёміліся ў мінулых класах?
- У чым праявіўся талент Анатоля Вярцінскага акрамя паэзіі? Прывядзіце прыклады.
- Пералічыце асаблівасці музычнага і літаратурнага жанра "рэквіем".

2. Выразнае чытанне верша.

- Добра, малайцы, вы добра падрыхтавалі дамашняе заданне. Зараз давайце звернемся да твора.

Апераджальнае заданне: падчас чытання вучням неабходна адзначыць радкі, якія паўтараюцца некалькі разоў.

(Вучні выразна чытаюць уступ і 1 частку пад музычнае суправаджэнне Моцарта "Рэквіем".) Слайд №3

**V. Тлумачэнне тэарэтычнага матэрыялу.**

1. Тэорыя літаратуры

- Мы з вамі заўважылылі, што кожная частка мае вядучы матыў, які ўзмацнякцца балючымі звесткамі. Для гэтага пісьменнік выкарыстоўвае сродкі мастацкай выразнасці, каб стварыць своеасаблівы малюнак верша.
- Якія словы паўтараюцца ва ўступе? ("Вы бачылі лес, дзе прагал скразны?")
-Дзе яны знаходзяцца? (У пачатку радка)
-Давайце паспрабуем даць тлумачэнне паняццю "анафара".
- Якія словы паўтараюцца ў 1 частцы? ("Кожны чацвёрты")
-Дзе яны знаходзяцца? ( У канцы страфы).
-Давайце паспрабуем даць тлумачэнне паняццю "эпіфара".

АНАФАРА – паўтарэнне аднолькавых гукаў, слоў ці словазлучэнняў у пачатку страфы або вершаванага радка.

ЭПІФАРА - паўтарэнне аднолькавых гукаў, слоў ці словазлучэнняў у канцы страфы або вершаванага радка. Слайд №4

**VI. Фізкультхвілінка** (Слайд № 5-8)

2.Уласныя назвы

Чытаючы 1 частку, вы сустрэлі імёны дзеда Талаша і Казея-малыша. Як вы лічыце, чаму аўтар прыгадвае менавіта гэтых герояў? Слайд №9-10.

-Давайце перачытаем эпілог "Урок спражэння". Адкажыце на пытанне:"Чаму аўтар пераносіць нас у сучасную школу на ўрок спражэння? Каб найбольш поўна адказаць на гэтае пытанне, звярніцеся зноў да эпіграфа." (Пакаленне, якое не ведае вайны, не павінна забывацца на яе ўрокі.)

3. Сувязь літаратуры з іншымі відамі мастацтва.

Каб ушанаваць памяць ахвяр Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі нашай краіны ўзведзены помнікі.

На слайдах паказваюцца помнікі, вучням неабходна назваць іх, расказаць калі ўзведзены. Звярніце сваю ўвагу на апошні слайд. Якое дачыненне ён мае да тэмы ўрока? (Слайд №11-16)

Настаўнік чытае верш.

***Когда три берёзки смеются счастливо,***
***А четвёртая стала священным огнём,***
***Помни: три белоруса остались живы,***
***А четвёртому вечную память поём.***
***Наталья Кончаловская***

-На ваенную тэматыку мастакамі напісана вялікая колькасць карцін. Вось некаторыя з іх. Паспрабуйце знайсці ў тэксце радкі з верша, якія адпавядаюць зместу карцін. (Слайд № 17-19).
Да сённяшняга ўрока Агінская Аня атрымала цікавае заданне. Яна паспрабавала перадаць свае пачуцці на паперы. Абарона праекта.

4. Асацыяцыя "Пошук".

Вайна лічыцца незакончанай да тых пор, пакуль не пахаваны апошні загінуўшы. У нашай краіне гэтыя словы перайшлі ў рух. (Слайд №20)
У 1995 годзе была створана Беларуская рэспубліканская Асацыяцыя "ПОШУК". Яе функцыі:

- ✓ Правядзенне работ па пошуку загінуўшых абаронцаў Айчыны;
- ✓ Даследчая праца ў архівах, дапамога рэдкалегіям кніг "Памяць" ва ўдакладненні спісаў загінуўшых;
- ✓ Высветленне імён загінуўшых.

5. Пераклад.

На мінулым уроку мы з вамі гаварылі, што творы Анатоля Вярцінскага перакладзены на розныя мовы свету. Сёння ў нас ёсць магчымасць паслухаць як гучыць на англійскай мове "Эпілог".

**VII. Абагульненне**

-З якімі тэрмінамі мы пазнаёміліся сёння на ўроку?
-Ці адчулі вы сувязь літаратуры з іншымі відамі мастацтва? Якімі?

**VIII. Рэфлексія.**

Зараз я прапаную вам прагледзець урывак з ваеннай кінахронікі часоў Вялікай Айчыннай вайны.
- Чым вас уразіў прагледжаны эпізод?
-Да чаго заклікае нас паэт у вершы?
-Давайце абагульнім усе тое, што было сказана на ўроку праз сінквейн на тэму "Вайна".

**IX. Выстаўленне адзнак.**

**X. Дамашняе заданне. (Слайд № 21)**

**III узровень:**

Выпісаць са слоўніка літаратуразнаўчых тэрмінаў паняцці "анафара", "эпіфара". Прывесці прыклады з веша
Анатоля Вярцінскага "Рэквіем па кожным чацвёртым".

**IV узровень:**

Выканаць тэст.

**V узровень:**

Падрыхтаваць вуснае выказванне на тэму
"Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі маёй сям'і".